# Будаўнікі і шахцёры вучацца

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСКА

Пачаліся заняткі ў Салігорскай школе рабочай моладзі. З кожным годам усё павялічваецца лік яе выпускнікоў. Дастаткова сказаць, што толькі ў мінулым годзе школу закончыла 111 чалавек.

Як правіла, нашы выпускнікі лепш працуюць, многія з іх сталі рацыяналізатарамі і прадаўжаюць вучобу ў тэхнікумах і інстытутах. Майстар механічнага цэха першага калійнага камбіната Татур чатыры гады назад закончыў нашу школу, паступіў у горны інстытут. Цяпер ён умела спалучае вучобу з працай на вытворчасці. Электрыкі Савін, Сірота, механік Старасцін, машыніст пад'ёмнага крана Мазунін, закончыўшы сем класаў школы рабочай моладзі, паступілі ў горнамеханічны тэхнікум.

Экзамен на атэстат сталасці ў сёлетнім годзе ў ліку іншых таварышаў будзе трымаць брыгадзір экіпажа горнапраходчага камбайна Арыстаў. Ён пачаў вучобу ў школе рабочай моладзі з сёмага класа. Аб яго экіпажы гавораць як аб адным з перадавых на рудніку першага калійнага камбіната.

Сёлета школа яшчэ больш разраслася. У гэтым навучальным годзе адкрыта 14 клас-камплектаў. У ёй навучаецца больш 330 чалавек. Трэба сказаць, што прыток навучэнцаў не спыняецца.

Амаль усе класы цяпер паралельныя. Вучань можа наведваць заняткі раніцой ці вечарам, гледзячы ў якую змену ён працуе. Створана некалькі паскораных класаў, у якіх жадаючыя могуць скончыць 5—8 класаў за два з палавінай гады, а 6—8 класаў — за два гады.

У школе ёсць умовы для плённай вучобы рабочых і служачых. Праводзяцца кансультацыі адзін раз у тыдзень па рускай мове і матэматыцы. Настаўніцкі калектыў папоўніўся выпускнікамі ВНУ, і цяпер тут склаўся свой калектыў.

Хутка школа рабочай моладзі размесціцца ў сваім будынку. Для гэтага вызваляюцца два дамы, якія былі заняты інтэрнатамі.

Пачаўся навучальны год, год плённай вучобы. І мы, настаўнікі школы, паклапоцімся, каб даць глыбокія веды сваім выпускнікам.

**В. ЦЕСАВЕЦ,**
**настаўнік Салігорскай школы рабочай моладзі.**